пасрэдна ў распрацоўцы розных тыпаў і мадэляў зносін, найбольш мэтазгодных для засваення студэнтамі вучэбных праграм; у знаходжанні своеасаблівага "сцэнарнага плана" для арганізацыі аўдыторных узаемаадносін; у забеспячэнні гэтых зносін змястоўнай інфармацыяй і сродкамі яе засваення; у выкарыстанні гуманістычных падыходаў да выхавання асобы будучага спецыяліста праз асабістае ўзаемадзеянне.

Трэба адзначыць, што рэальная сітуацыя, якая складаецца ў сучасны перыяд у вышэйшых навучальных установах нашага грамадства, не заусёды адпавядае патрабаванням арганізацыі навукова-тэарэтычнай, вучэбна-метадычнай дзейнасці выкладчыка. Адзін са шляхоў выйсця з гэтага становішча бачыцца ва ўдасканальванні інфармацыйна-камунікатыўных магчымасцей выкладчыкаў, якія з-за шматлікіх праблем (недахоп новых падручнікаў і метадычных дапаможнікаў, адсутнасць належнага інфармацыйнага фонду і неабходных дыдактычных матэрыялаў, недастатковая аснашчанасць тэхнічнымі сродкамі, неабсталяванасць аўдыторый і гэтак далей) павінны выступаць выключна ў ролі галоўных інфарматараў ці фактычна з'яўляцца адзінай крыніцай спецыяльных ведаў.

Рэчаіснасць ставіць перад выкладчыкамі шэраг агульных задач, звязаных з авалоданнем і выкарыстаннем значнага аб'ёму новай прафесійнай інфармацыі, сярод якіх можна вылучыць:

- збіранне, абагульненне і сістэматызацыя інфармацыі па шырокаму колу пытанняў як унутры асабістай прафесійнай дзейнасці, так і на яе межах з іншымі галінамі ведаў;
- аналіз сучасных тэндэнцый і пранікненне ў сутнасць змен у сацыяльнай інфармацыі;
- пераасэнсаванне старых ідэй і асэнсаванне новых блокаў інфармацыі, выяўленне сувязі паміж старымі ідэямі і новымі да іх падыходамі;
- пошук шляхоў практычнага прымянення новай інфармацыі як у навучальным працэсе, так і непасрэдна ў сферы прафесійнай дзейнасці будучага спецыяліста.

Вывучэнне толькі некаторых інфармацыйна-камунікатыўных аспектаў дзейнасці выкладчыка вышэйшай навучальнай установы на прыкладзе вопыту выкладчыцкай дзейнасці кафедры мэнеджмэнту сацыяльна-культурнай сферы дазваляе выказаць меркаванне, што ўдасканальванне агульнага прафесійнага майстэрства ў значнай меры залежыць ад актыўнасці інфармацыйнага пошуку і камунікатыўных магчымасцей кожнага. Такім чынам, інфармацыйна-камунікатыўная дзейнасць выкладчыка ва ўмовах вышэйшай навучальнай установы патрабуе цэлага комплексу навукова-метадычных ведаў, практычных уменняў, асабістых здольнасцей і імкненняў.

Фашчыліна І.М.,
выкладчык

## ВЫКАРЫСТАННЕ Ў НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ АКТЫВІЗУЮЧЫХ МЕТАДАЎ НАВУЧАННЯ ЯК СРОДКУ ПРАФЕСІЙНАЙ АДАПТАЦЫІ СТУДЭНТАЎ

Сёння ў вышэйшай школе перавагу мае традыцыйная імператыўная педагогіка. У ёй выхаванне і навучанне будуюцца на перадачы ўзораў дзейнасці ў выглядзе набору "інструментаў" - ведаў, уменняў і навыкаў. Навучальны працэс у асноўным плануецца толькі зыходзячы з неабходнасці перадачы і ўспрымання ведаў. Ён ўяўляецца як сукупнасць лекцый і семінарскіх заняткаў, а кантралюецца шляхам экзаменацыйных праверак.

Час патрабуе новых падыходаў да падрыхтоўкі будучых спецыялістаў.Неабходна выкарыстоўваць найбольш прагрэсіўныя формы работы з імі, якія садзейнічаюць актывізацыі навучальнага працэсу. Імператыўная педагогіка павінна дапоўніцца педагогікай супрацоўніцтва. Практыка арганізацыі вольнага часу выкрывае недахопы навучання, якія ўстараняюцца, як правіла, у працэсе прафесійнай дзейнасці ў розных установах культуры. Адбываюцца давучванне і перавучванне маладога спецыяліста. І адбываецца гэта таму, што студэнты нашай ВНУ за вялізным масівам навучальнай інфармацыі страчваюць галоўнае - бачанне сваёй будучай спецыяльнасці.

Рашэнне названых праблем трэба шукаць на шляхах радыкальных змен навучальна-выхаваўчага працэсу, у шырокім укараненні актыўных метадаў навучання і выхавання студэнтаў: сітуацыйнае мадэліраванне, дзелавая гульня і інш.

У значнай ступені выпраўленню склаўшайся сітуацыі могуць садзейнічаць дзелавыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гульні. У працэсе гульні студэнты больш дакладна, чым на іншых формах заняткаў, знаёмяцца з будучай спецыяльнасцю, знаходзяць свой прафесійны твар, атрымліваюць задавальненне ад спасціжэння прафесіі, набываюць вопыт, які фарміруецца толькі пры выкананні прафесійных функцый. З дапамогай гэтага метаду можна мадэліраваць прафесійныя сітуацыі з тыповымі памылкамі, а потым падвяргаць іх сістэматпланаваму аналізу. Дзелавая гульня як метад уключае розныя формы актыўнага навучання: дыскусіі, аналіз канкрэтных сітуацый, мадэліраванне пэўных прафесійных дзеянняў і г.д.

Неабходна адзначыць, што актыўныя формы стаяць у шэрагу найбольш эфектыўных сродкаў сацыяльнай і прафесійнай адаптацыі студэнтаў. У сацыяльным сэнсе мяркуецца актыўнае прыстасаванне студэнта да ўмоў сацыяльнага і прафесійнага асяроддзя. Прафесійная ж адаптацыя ідзе па многіх напрамках. Напрыклад, дасягаецца адэкватнае ўспрыманне практычнай дзейнасці. Выпрацоўваюцца навыкі аналізу і ацэнкі сітуацый, прыняцця і аптымальнай рэалізацыі прафесійных рашэнняў. Фарміруецца дакладная і дынамічная рэакцыя на сітуацыі, якія ўзнікаюць пры выкананні традыцыйных дзеянняў. Значна ўзмацняецца эфектыўнасць набытых навыкаў пры вырашэнні нестандартных праблем, пры карэкціроўцы выконваемай прафесійнай дзейнасці. Механізм адаптацыі універсальны: ён дзейнічае не толькі ў рамках навучальна-выхаваўчага працэсу, які прадугледжвае прыстасаванне будучага спецыяліста да прафесійных асаблівасцей, але і выхоўвае жаданне самаўдасканальвання ў час набыцця прафесіі і самастойнай працы. У студэнтаў фарміруюцца станоўчыя прафесійныя стэрэатыпы, якія ўлічваюць псіхафізіялагічныя асаблівасці кожнага. Гульнявыя формы спрыяюць і адаптацыі мыслення студэнтаў: лагічнага, эмпірычнага, эўрыстычнага.

Адаптацыя маладога спецыяліста павінна быць накіравана на фарміраванне станоўчай устаноўкі да сваёй прафесійнай дзейнасці, на пошук яе новых форм.

Глінік Т.М.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## ВЫКЛАДАННЕ КУРСА КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ ЯК АДЗІН СА СРОДКАЎ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ КУЛЬТУРНАЙ АДУКАЦЫІ

Сучасны этап развіцця незалежнай Рэспублікі Беларусь патрабуе новага падыходу да існуючай сістэмы падрыхтоўкі кадраў, асэнсавання маштабу тых змен, якія адбываюцца ў гуманітарных навуках, адукацыі. Выключную ролю тут павінны адыгрываць універсітэты, прынамсі універсітэты культуры, якія вызначаюць спецыфічны і непаўторны шлях нацыі да агульначалавечага, да Асобы, Духоўнасці, да нацыянальнай свядомасці. На жаль, яшчэ не ўсе зразумелі ў гэтым аспекце праблему ролі культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа, якая на прыканцы XX ст. ледзь не апынулася на мяжы знікнення. Красамоўным прыкладам можа стаць лёс беларускай мовы, на якой гаварыла толькі частка студэнтаў і выкладчыкаў як у старэйшым БДУ, так і ў больш маладзейшым Беларускім універсітэце культуры (былым МІК), якая пад націскам рускамоўнага асяроддзя ператварылася ў мову "замежную".

Абвешчанае адраджэнне нацыянальнай культуры Беларусі застанецца толькі на паперы, калі не дбаць пра адукацыю асобы з пункту гледжання авалодання найбагацейшай культурнай спадчынай, увасабляючай ў сабе нацыянальны менталітэт беларусаў, з аднаго боку, і пазнанне саміх сябе як часцінкі агульначалавечага, агульнадухоўнага, з другога.

Шматлікія публікацыі ў перыядычным друку, у часопісе "Спадчына", штотыднёвіках "Літаратура і мастацтва", "Культура", "Наша слова" падымаюць пытанні пра культурна-гістарычную спадчыну беларусаў. Але наўрад ці ўсе пагодзяцца з поглядамі А.Грыцкевіча, М.Ермаловіча, М.Ткачова, А.Мальдзіса, Л.Лыча ды іншых навукоўцаў, бо надта глыбока пранікалі ў свядомасць людзей і ўкараніліся там казкі, легенды савецкіх даследчыкаў, складзеныя пра шматвяковую нацыянальную культуру. Раскрыццё ж асноўных праблем і пытанняў, на наш погляд, магчыма толькі ў варунках сістэмы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ